# Тав. Гамарнік —начальнік ПУР РСЧА

МАСКВА, 16. Загадам РВС СССР за подпісам Варашылава начальнік ПУР'а РСЧА і член РВС СССР тав. БУБНОЎ вызваляецца ад займаемай пасады з 1 кастрычніка 1929 году з прычыны назначэньня народным камісарам асьветы РСФСР. Член РВС СССР тав. ГАМАРНІК назначаецца начальнікам ПУР'а РСЧА.

---

Тав. ГАМАРНІК, ЯН БАРЫСАВІЧ, нарадзіўся ў 1894 годзе. Член УсеКП(б) з 1916 году.

У 1917 годзе да Кастрычніка быў членам прэзыдыуму кіеўскага камітэту партыі і адзін час сэкратаром яго. Быў адным з кіраўнікоў кастрычнікаўскага паўстаньня ў Кіеве. Разам з тав. Бубновым прымаў удзел у кіраўніцтве барацьбой супроць наступаўшых на Украіну

гетманшчыны быў членам бюро харкаўскага губкому, членам ЦК Украіны, старшынёй адэскага губкому партыі. У пэрыяд барацьбы супроць Дэнікіна быў членам РВС паўднёвай групы I арміі, якая ўтварала вядомы прарыў дэнікінска-пятлюраўскага кальца ад Адэсы да Кіеву, за што ўзнагароджан ордэнам Чырвонага Сьцягу. Затым быў камісарам 58 дывізіі і прымаў удзел у налеце 1919 году на Кіеў, які быў заняты дэнікінцамі, а праз некалькі месяцаў у вызваленьні Кіеву ад белых.

У 1920 годзе быў дэмобілізаваны, пасьля чаго быў старшынёй адэскага губкому партыі, старшынёй кіеўскага губкому партыі і ў працягу трох год да 1923 году старшынёй губвыканкому Кіеўшчыны. Затым быў перакінуты на Далёкі Усход, дзе быў старшынёй Дальрэўкому, старшынёй крайвыканкому і сэкратаром Далькрайкому партыі. Апошняя праца—сакратар

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы